Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 17. Варыянт 4**

**Білет 17. Практычнае заданне.** Станаўленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Удзел БССР у стварэнні СССР. Узбуйненне тэрыторыі БССР.

**Заданні склала:** Кухарчык Таццяна Аляксандраўна, настаўнік гісторыі, Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Поразаўская сярэдняя школа"

**На аснове прадстаўленых матэрыялаў адкажыце на пытанні:**

**1.**Якія савецкія рэспублікі заключылі Дагавор абстварэнні СССР?
**2**. Пакажыце на карце тэрыторыю БССР пасля заключэння Рыжскай мірнай дамовы. Якія тэрыторыі ўвайшлі ў склад БССР у выніку ўзбуйнення ў 1924 і 1926 гг.?
**3.**Растлумачце, чаму на гербе ССРБ змешчаны выявы сярпа і молата. Параўнайце герб ССРБ і сучасны герб Рэспублікі Беларусь.
**4.**Ці згодны вы з тым, што стварэнне СССР адпавядала жыццёвым інтарэсам Савецкай Беларусі. Аргументуйце свой адказ

<table>
<tr><th>Крыніца 1.Герб ССРБ (рэканструкцыя па апісанні)</th><th>Крыніца 2. Тэрыторыя Беларусі па ўмовах Рыжскай мірнай дамовы.Узбуйненне БССР у 1924 і 1926 гг.</th></tr>
<tr><td>
</td><td>
</td></tr>
</table>

**Крыніца 3**

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Пастанова IV Усебеларускага з'езда Саветаў аб стварэнні СССР ад 18 снежня 1922 г.**

Чацвёрты Усебеларускі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў лічыць, што прапанова Усеўкраінскага з'езда Саветаў аб неадкладным афармленні ўжо фактычна існуючага Саюза Савецкіх Рэспублік, аб'ядноўваючы супраць адзінага фронту сусветнага капіталу сілы рабочых і сялян усіх савецкіх рэспублік на асновах узаемнай роўнасці, цеснай , у той жа час забяспечваючы самастойнае нацыянальна-культурнае будаўніцтва і ствараючы неабходныя гарантыі для праяўлення гаспадарчай ініцыятывы кожнага з членаў, адпавядае жыццёвым інтарэсам Савецкай Беларусі і таму павінна атрымаць больш хуткае ажыццяўленне на маючым адбыцца з'ездзе ўсіх савецкіх рэспублік.

IV з'езд Саветаў Беларусі выказвае сваю глыбокую ўпэўненасць, што з'езд РСФСР сумесна з прадстаўнікамі Украіны, Беларусі і Закаўказскіх рэспублік стварае адзіны, моцна згуртаваны саюз працоўных усіх брацкіх рэспублік, даручае сваёй дэлегацыі, якая выбіраецца для ўдзелу на Усерасійскім з'ездзе Саветаў. і здзейсніць фармальныя акты, якія замацоўваюць брацкі Саюз Сацыялістычных Савецкіх Рэспублік.